***Дашкевіч Д. А., Бубіга І. В.***

# ПЫТАННІ ЧАЛАВЕЧАЙ МАРАЛЬНАСЦІ І ДУХОЎНАСЦІ Ў РАМАНЕ АРТУРА ХЕЙЛІ "КАНЧАТКОВЫ ДЫЯГНАЗ"

***Навуковы кіраўнік выкладчык Носік А. А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

Антрапацэнтрызм з яго ўвагай да чалавека як унікальнага тварэння прыроды прыбягае да шматаспектнага аналізу ўзаемаадносін паміж людзьмі і аднаchасова здзяйсняе спробы разабрацца, што ж кіруе чалавечым мысленнем, што штурхае яго на здзяйсненне кожнага канкрэтнага ўчынку. Сувязь агульначалавечага і навуковага найбольш яскрава прасочваецца ў медыцыне, а да таго ж і навейшая літаратура ўсё часцей і часцей звяртаецца да праблем маральнасці.

Увагу сучаснага медыка, які неабыякавы да глабальных, вечных пытанняў, якія павінны хваляваць кожнага чалавека, абавязкова прыцягне раман Артура Хейлі "Канчатковы дыягназ". Твор закранае дастаткова шырокі спектр пытанняў чалавечай маральнасці і духоўнасці, прымушае задумацца пра тое, хто мы і навошта мы выбіраем сабе тую ці іншую прафесію. Прачытанне такой кнігі можа стаць для могіх сапраўдным вопытам, які перажываецца, набываецца разам з яе персанажамі. Яна пераносіць нас у бальніцу Трох Графстваў, якой нельга даць адназначную характарыстыку. З аднаго боку гэта занядбалая ва ўсіх сэнсах лякарня, з другога – прыстанак "вялікіх розумаў". Тут можна правесці паралель з агнём, які ўвасабляе аднаchасова стварэнне і разбурэнне. Так, менавіта разбурэннем аўтар вырашыў завершыць свой раман. Падзеі, якімі ён насычаны, прымушаюць задумацца над нашым укладам жыцця, расставіць прыярытэты і прывесці ў парадак думкі, а ў выніку і дзеянні. Кампетэнтнасць разам з чалавечнасцю – аснова, падмурак, на якім павіненн "будаваць" сябе кожны ўрач.

Репозиторий БГМУ